Раманенкава В.І., студ. гр. 519 ФММ
БДУ культуры і мастацтваў
Навуковы кіраўнік – Густова-Рунцо Л. А.,
канд. мастмцтвазнаўства, дацэнт

# БЕЛАРУСКАЯ РЭЛІГІЙНАЯ НАРОДНАЯ ПЕСНЯ Ў ПАСЛЯВАЕННЫ ЧАС

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Спеўная культура беларусаў мае важны аспект – рэлігійны. Рэлігійныя песні з кананічнымі тэкстамі выконваюцца ў храме, тады іх называюць сакральнымі. Песні з народнымі тэкстамі, ці, якія сталі народнымі напрацягу іх выканання, называюць духоўнымі вершамі, рэлігійнымі песнямі, песнямі пілігрыма ці песнямі богагласніка.

Народны быт, які з некаторага часу ўсё больш і больш адмяжоўваў сабе прастору ў гісторыі таго ці іншага з народаў, якія абазначылі сябе на глебе гістарычнага развіцця ўсяго чалавецтва, у канцы канцоў становіцца самастойным прадметам параўнальнай навукі, якая, разбураючы перашкоды гістарычнай адасобленасці грамадскасці, даследуе яе асноўныя элементы і натуральнае развіццё, незалежна ад штучных пластоў гістарычнай цывілізацыі.

Беларуская рэлігійная культура ў беларускай навуцы традыцыйна паўставала ў якасці дзвюх антаганістычных пачаткаў: традыцыйнай народнай і царкоўнай культур, якія развіваюцца ва ўмовах дваяверства. Нацыянальная масавая свядомасць беларусаў падавалася з кропкі гледжання спалучэння хрысціянскага і язычніцкага вераванняў.

Цельнасць і адзінства народнага светасузірання спарадзілі адзінства музычна-стылістычных асаблівасцей царкоўнага і народнага спеву.

На шчыльнае ўзаемадзеянне прафесійнага царкоўнага і беларускага народна-спеўнага мастацтва ўказваюць агульныя жанравыя асаблівасці, сродкі выразнасці, стылі спеваў. Калі параўноўваць характэрныя асаблівасці старажытнага літургічна-царкоўнага і беларускага народна-спеўнага мастацтва, можна адзначыць наступныя агульныя рысы: сінтэз слова і напеву; роднасць у

галіне ладава-меладычнай прыроды народнай і царкоўнай спеўнай культуры; агульны прынцып папеўкі ў якасці асновы і музычнай структуры літургічных напеваў, і раннетрадыцыйных беларускіх песень аднаго абраду; агульны прынцып творчасці па мадэлі з пэўнай імправізацыйнасцю; роднасць рытмаметрычнай пабудовы; агульная выканальніцкая імправізацыйна-рытмічная манера раннетрадыцыйнай народнай творчасці; аднолькавыя стылявыя асаблівасці выканання старажытных літургічных спеваў і ранніх беларускіх народных песень; агульная манера ўзяцця дыхання пры спевах; агульныя прынцыпы развіцця шматгалосся і яго стылістычныя асаблівасці; агласоўка зычных у старажытнейшых пластах беларускага абрадавага фальклору і старажытных богаслужбовых песнапеннях. [2]

Абрадавы фальклор у заходніх і паўднёвых славян адлюстроўваецца і ў бытаванні вялікай колькасці тэкстаў біблейска-евангельскай тэматыкі, якія атрымалі назву духоўныя вершы. Яны блізкія да малітоўных тэкстаў і, як адзначаў Гнацюк, знаходзяць уздзеянне польскіх, славацкіх і сербскіх духоўных спеваў.

Е. Ф. Карскі заўважыў тэндэнцыю ў сістэме беларускага фальклору “замяніць калядку духоўным вершам”, хоць ён жа падкрэсліваў, што ў беларусаў (у параўнанні з іх бліжэйшымі славянамі-суседзямі, акрамя рускіх) яшчэ нешматлікія рэлігійныя матывы ў калядках і шчадроўках. На Украіне і ў Сербіі такая з’ява становіцца паўсюднай. А. Н. Весялоўскі ўводзіць для такога роду тэкстаў падвоенае жанравае азначэнне – “верш-калядка” і безумоўна адносіць гэты жанр да старажытных. [1]

Духоўна верш – гэта жанр народна-спеўнага мастацтва рэлігійнага зместу, распаўсюджаны сярод усіх славянскіх народоў.

Духоўны верш жыве не ў шырокіх народных масах, у адрозненні ад казкі ці пагаворкі. Яго носьбітам з’яўляецца клас прафесійных спевакоў, таленавітых і навучаных. Духоўныя спевакі з’яўляюцца пасрэднікамі паміж царквой і

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

народам, яны перакладаюць на народную мову. Можна, нават, уявіць, што ў асяродку духоўных спевакоў прысутнічалі прадстаўнікі розных рэлігіёзных поглядаў.

Адной з істотных тэндэнцый фармавання кожнай нацыянальнай культуры з'яўляеццюцца засваенне і творчая перапрацоўка набыткаў іншых культур, далучэнне да скарбніцы сусветнай цывілізацыі большасць характэрных для Новага часу музычных жанраў, на глебе якіх фармаваліся нацыянальныя творчыя школы. Немагчыма ўявіць сабе развіццё французскай, польскай, нямецкай, рускай, беларускай культур без агульнаеўрапейскага кантэксту, без самых разнастайных, прамых і ўскосных сувязяў, запазычанняў, узаемаўплываў.

Дыялог з Захадам на працягу стагоддзяў быў прынцыпова важны ў фармаванні айчыннай культуры, не менш важны, чым дыялог з Усходам, з Маскоўскай дзяржавай. Магутнае ўздзеянне заходнееўрапейскай традыцыі абсалютна відавочнае ў беларускім музычным мастацтве, а асабліва ў кантавай песнетворчасці.

Кантавая культура на Беларусі цесна злучана з гістарычнай эпохай, з яе сацыяльна-эканамічнымі асаблівасцямі, з ідыялогіяй большай часткі беларускага насельніцтва, а таксама з нацыянальна-вызваленчай барацьбой беларускага грамадства. У лепшых узорах беларускай кантавай культуры своеасабліва адлюстравана гэта барацьба; канты і псальмы перадаюць светасузіранне чалавека сваёй эпохі, яго ідэалы, надзеі і памкненні.

У Беларусі канты набылі ярка выяўленыя нацыянальныя рысы дзякуючы спалучэнню з традыцыйнай народнай музыкай. Вылучаюць свецкія канты (уласна канты) і рэлігійныя канты (псальмы). Большасць кантаў ствараласяна беларускай мове з адхіленнямі ў царкоўнаславянскую і польскую. Беларускія канты і псальмы нясуць у сабе элементы пазацаркоўнай песеннай культуры (фальклору), што было характэрна і для гусіцкіх гімнаў, і для лютэранскіх і кальвінісцкіх харалаў. [4]

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Калі казаць пра кантавую культуру на Беларусі і яе якасных складніках, неабходна адзначыць наступнае: вядома, што грэка-каталіцкая (уніяцкая) царква, а дакладней манахі ордэна Базіля Вялікага, напаўнялі Беларусь і Украіну вялікай колькасцю твораў: духоўнымі псальмамі і польскімі кантычкамі (песнапеннямі), якія пазней былі перакладзены на беларускую і украінскую мовы, а калі-нікалі заставаліся на польскай і лацінскай мовах. Гэтыя "спевы" прымусова прапаноўваліся насельніцтву замест "бесовских", гэта азначае народных песень, якія забараняліся не толькі каталіцкай, але і праваслаўнай цэрквамі. [3]

У пасляваенныя гады перад беларускім мастацтвам сталі новыя задачы, звязаныя з узнаўленнем назапашаных духоўных каштоўнасцей. У тыя часы ўжо ўсталяваліся ідэалагічныя крытэрыі мастацтва і былі абвешчаны правы на нацыянальную і класічную спадчыну праз прызму асэнсавання гістарычнай пераемнасці новага ў адносінах да багатага вопыту мінулага пры моцнай апоры на нацыянальны фальклор. (З аднаго боку – гэта адраджэнне традыцыйнага музычнага багацця, з другога – стварэнне новага).

У апошняй чвэрці ХХ стагоддзя беларуская рэлігійная музычная свядомасць заявіла пра сябе ў новай якасці – у якасці адзінага, сабornага імкнення ствараць у згодзе з рэлігіяй і высокай духоўнасцю.

У апошнія гады акрэслілася тэндэнцыя да канцэртнага выканання ўласна царкоўных спеваў і нават наладжваюцца фестывалі царкоўных спеваў. І вось тут узнікае парадокс: з аднаго боку, царкоўныя спевы – гэта жанр строга абіходны, з другога – яны гучаць на канцэртнай эстрадзе, з’яўляюцца інтанацыйнай і духоўнай крыніцай для свецкіх твораў, прафесійнага мастацтва ў цэлым. Уваскрашэнне на новай аснаве спосабу спеваў і дэталізацыя царкоўнай тэматыкі сталі зваротным пунктам у развіцці беларускай музыкі.

Рэканструкцыя, або адраджэнне вобраза старажытнасці адбываецца ў выглядзе творчай інтэрпрэтацыі старажытнай інтанацыйнасці, жанраў,

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

вобразаў, тэм, а таксама ў выглядзе ўваскрашэння асобных жанраў царкоўнага спеўнага мастацтва (напрыклад, спевы, малітвы, канты, псальмы, канцэрт), манодыі знаменнага распеву, грыгырыянскага харалу. Што тычыцца музычнага маўлення, то тут варта адзначыць сінтэз старога і новага і так званае “памеранае наватарства”. Актуалізацыя старыжтнага этаса і нацыянальнай гісторыі звязана са своеасаблівым усведамленнем гістарычнай тэмы і архаічных пластаў культуры.

Список литературы:

1. Бахтина, В. А. Место духовного стиха в системе жанров славянского фольклора. / В. А. Бахтина // Славянская традиционная культура и современный мир: Сборник материалов научно-практической конференции. – М.: Государственный республиканский центр русского фольклора. – 1997. – Вып. 2 – с. 21-27

2. Густова, Л. А. Белорусская народно-песенная и религиозная культуры: историко-коммуникативный аспект (по материалам экспедиций Гродненщины и Белосточчины). / Л. А. Густова // Палявая фалькларыстыка і этналогія даследвання лакальных культур Беларусі. – Мінск: Міністэрства культуры РБ УА “БДУКіМ” інстытут павышэння кваліфікацыі і перападрыхтоўкі кадраў. 2008 – с. 126-131

3. Варфаламеева Т. А., Голікава Л. Ф…. Беларусы. Музыка / Т. А. Варфалаемеева, Л. Ф. Голікава… – Мінск: “Беларуская навука”, 2008 – 697 с.

Сасноўскі, З. Гісторыя беларускіх музычных уплываў / З. Сасноўскі. – Мінск: “Медысон”, 2009 – 138 с.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ